Весці БДПУ. Серыя 2. 2021. № 2. С. 15–20

УДК [94:352](476)"18/19"

# ПАЛІТЫКА САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА САСЛОЎНАГА ДВАРАНСКАГА САМАКІРАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX ст.)[1]

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

**С. А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

UDC [94:352](476)"18/19"

# POLICY OF AUTOCRACY IN CONNECTION WITH ESTATE NOBILITY SELF-GOVERNMENT IN BELARUS (THE SECOND HALF OF THE 19th – THE BEGINNING OF THE 20th CENTURY)

**A. Zhitko,**
*Doctor of History, Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

**S. Talmachova,**
*PhD in History, Associate Professor, Head of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 15.04.21.

Received on 15.04.21.

У артыкуле раскрыта палітыка расійскага ўрада ў адносінах да карпаратыўнай арганізацыі вышэйшага саслоўя Беларусі пасля пераводу заходніх губерняў на ваеннае становішча ў 1861 г. да пачатку Першай сусветнай вайны. Даказана, што ў 60-х гг. XIX ст. дваранскае саслоўнае самакіраванне ў беларускіх губернях было фактычна ліквідавана. У першую чаргу гэта тычылася выбарных прадвадзіцелей дваранства і другіх службовых асоб органаў саслоўнага самакіравання і замяшчэння пасад у дзяржаўным апараце па выбарах ад дваранства на павятовых і губернскіх сходах.
Спробы расійскага ўрада аднавіць дваранскія выбары пад час Першай расійскай рэвалюцыі былі неэфектыўнымі, ды яны не мелі палітычнага сэнсу. Фактычная бессаслоўнасць расійскага грамадства ў пачатку XX ст. вымагала дваран Беларусі сканцэнтраваць сваю ўвагу на выбарах у Дзяржаўную думу, а з 1911 г. – і ў земствы.

*Ключавыя словы:* палітыка самадзяржаўя, дваранскае самакіраванне, Беларусь, прадвадзіцелі дваранства, выбары, дваранскія сходы.

The article reveals the policy of Russian government in the relation to corporative organization of the highest estate of Belarus after switching the western provinces to martial law in 1861 before the beginning of the World War I. It is proved that in the 60s of the 19th century the nobility estate self-government in Belarusian provinces was practically abolished. First of all it concerned the elective marshals of the nobility and other service persons of the bodies of estate self-government and replacing positions in state apparatus on elections from nobility on district and provincial gatherings.
Attempts of the Russian government to renew the nobility elections in the time of the first Russian Revolution were not effective and they did not have any political sense. Actual absence of estate in Russian society in the beginning of the 20th century forced the nobility of Belarus to concentrate their attention on the elections to State Duma and since 1911 also to zemstvos.

*Keywords:* policy of self-government, nobility self-government, Belarus, marshals of the nobility, elections, nobility gatherings.

*Уводзіны.* Даследаванне адносін расійскага ўрада да дваранскай карпаратыўнай арганізацыі ў Беларусі неабходна праводзіць ў рэчышчы агульнай праблемы, якая звязана з вызначэннем месца і ролі дваранства ў палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці края. З другой паловы XIX ст. гэтыя адносіны мелі адкрыта абмежавальны і дыскрымінацыйны характар, таму ў задачу даследчыка ўваходзіць перш за ўсё раскрыццё іх матывацыі. Сапраўды, калі саслоўе, якое заўсёды лічылася прыхільнікам самадзяржаўя, аказваецца яго галоўным ворагам, дык тлумачыць гэта толькі нацыяналістычнымі памкненнямі не выпадае. Тут больш правамерна ставіць пытанне аб ролі дваранства ў культурна-нацыянальным адраджэнні Беларусі, яго супрацьдзеянні русіфікатарскай палітыцы расійскага ўрада.

[1] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

З улікам усяго гэтага ў артыкуле аналізуецца як мэта, якую праследаваў царызм пры стварэнні дваранскай карпаратыўнай арганізацыі, так і палітыка самадзяржаўя ў дачыненні да праблемы аднаўлення дваранскага саслоўнага самакіравання пасля паўстання 1863–1864 гг.

*Асноўная частка.* Карпаратыўная арганізацыя расійскага дваранства заканадаўча была аформлена «Грамотой на права, вольности и преимущества благородного российского дворянства» ад 21 красавіка 1785 г., па якой вышэйшае саслоўе атрымала пэўнае самакіраванне, усю павятовую і некаторую частку губернскай улады. Заканадаўства па гэтых пытаннях з некаторымі зменамі захавалася да 1917 г. Пасля далучэння беларускіх зямель да імперыі саслоўнае самакіраванне распаўсюджвалася і на набілітэт Беларусі.

Разам з тым, неабходна мець на ўвазе, што шляхта мела сваю карпарацыю і ў Рэчы Паспалітай з больш шырокімі правамі, чым расійскае дваранства. Саслоўнае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай было трохузроўневае – павятовае, ваяводскае. Шляхта з свайго асяроддзя выбірала дэпутатаў на вальны сейм. Апошні з'яўляўся вышэйшым заканадаўчым органам у дзяржаве, які прымаў важнейшыя рашэнні ў правядзенні знешняй палітыкі, а з канца XVI ст. дэпутаты вальнага сейма атрымалі права выбару і караля.

Даравальная грамата расійскаму дваранству 1785 г. прадугледжвала стварэнне губернскай і павятовай арганізацыі вышэйшага саслоўя. Вышэйшымі распарадчымі органамі дваранскіх таварыстваў з'яўляліся губернскія і павятовыя сходы. Павятовыя сходы звычайна займаліся падрыхтоўкай да губернскіх: праверкай спісаў дваран павета, высвятленнем іх выбарчых правоў, папярэднім абмеркаваннем асобных пытанняў і г. д. Усе вышэйшыя карпаратыўныя справы вырашаліся на губернскіх сходах. На іх заслухоўваліся справаздачы аб выкананні прынятых раней пастаноў, зацвярджаліся зборы на прыватныя дваранскія патрэбы, выбіраліся ўсе службовыя асобы карпаратыўных органаў: губернскія прадвадзіцелі, дэпутаты і сакратары дваранскіх дэпутацкіх сходаў, засядацелі дваранскіх апек, кандыдаты для замяшчэння шэрагу каронных пасад у органах мясцовага кіравання і суда [1, арт. 167]. Напрыклад, міравыя пасрэднікі, якія рэалізоўвалі аграрныя рэформы, а пазней земскія ўчастковыя начальнікі выбіраліся толькі з асяроддзя спадчыннага памеснага дваранства. Дваранству належала права – і гэта лічылася адной з важнейшых прывілей – падаваць праз губернскіх прадвадзіцелей ці дэпутатаў прашэнні ці скаргі губернскаму начальству, міністрам і непасрэдна імператару.

Выбарныя прадвадзіцелі дваранства з'яўляліся адным з важнейшых інстытутаў і ў дваранскай саслоўнай арганізацыі, і ў сістэме мясцовага кіравання. Кола абавязкаў прадвадзіцелей было вельмі шырокім і разнастайным. Яны мелі дачыненне да ўсіх сфер мясцовага кіравання і гаспадаркі [1, арт. 294, 295]. Губернскі прадвадзіцель афіцыйна лічыўся першай пасля губернатара асобай у губерні. Калі губернскі прадвадзіцель усё ж такі часткова засланяўся губернскай уладай, то павятовы быў сапраўды гаспадаром павета. Ён фактычна замяняў павятовае звяно ў мясцовым бюракратычным апараце.

У беларускіх губернях апошнія выбары на губернскіх дваранскіх сходах прайшлі ў канцы 1858 – пачатку 1859 г. Наступныя павінны былі адбыцца ў снежні 1861 і ў студзені 1862 г. Аднак з 1861 г. у краі пачаліся хваляванні сярод дваранства рымска-каталіцкага веравызнання, якія складалі тут абсалютную большасць у параўнанні з прадстаўнікамі іншых канфесій. На пачатку 1861 г. у адпаведнасці з царскім указам адтэрміноўваліся дваранскія выбары ў Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях у сувязі з пераводам іх на ваеннае становішча [2, л. 75]. На падставе правіл ад 5 жніўня 1861 г. пры пераводзе якіх-небудзь мясцовасцей Заходняга краю на ваеннае становішча генерал-губернатару давалася права вызваляць ад займаемых пасад чыноўнікаў усіх устаноў [3]. З 27 кастрычніка 1861 г. гэта правіла распаўсюджвалася і на прадвадзіцелей дваранства заходніх губерняў [2, л. 40].

Пасля пачатку паўстання, у якім актыўны ўдзел бралі дваране-каталікі, рэпрэсіі ў адносінах да вышэйшага саслоўя краю ўзмацніліся. Так, па ўказе ад 18 красавіка 1863 г. у сувязі з выхадам у адстаўку 28 асоб Гродзенскай губ., якія займалі пасады павятовых прадвадзіцелей дваранства, павятовых суддзяў і міравых пасрэднікаў, гэтыя пасады былі замешчаны чыноўнікамі па прызначэнні ад урада [2, л. 75]. Па прадстаўленні Заходняга камітэта ў адпаведнасці з указам ад 27 мая 1864 г. усе службовыя месцы ў краі, а таксама і іх начальнікі, якія мелі непасрэднае дачыненне да сялянства, павінны былі быць заменены выключна асобамі рускага

паходжання [4, л.60]. У першую чаргу гэта тычылася павятовых прадвадзіцелей дваранства і міравых пасрэднікаў.

Па законе ад 17 сакавіка 1867 г. Віленскаму генералу-губернатару было дадзена права замяшчаць пасады ўсіх прадвадзіцелей дваранства толькі асобамі рускай нацыянальнасці па прызначэнні ад урада [4, л. 104]. Да гэтага часу пасада прадвадзіцеля была ганаровай і не аплочвалася. Аднак па дадзеным законе павятовыя прадвадзіцелі дваранства станавіліся старшынямі павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў з жалаваннем у памеры 2500 руб. штогод. Тым самым, павятовы прадвадзіцель і ён жа старшыня з'езда пераўтвараўся ў звычайнага чыноўніка, што супярэчыла духу саслоўнага самакіравання. Пры гэтым расійскі ўрад здолеў заахвоціць кандыдатаў на гэтыя пасады з рускіх губерняў і адправіць у адстаўку прадвадзіцелей-католікаў. У выніку пасады прадвадзіцелей дваранства ў краі занялі альбо мясцовыя рускія памешчыкі, альбо чыноўнікі з унутраных губерняў імперыі, якія нават не мелі дваранскай годнасці. Пазней МУС вымушаны быў прызнаць, што рускія прадвадзіцелі не мелі ў краі ні ўплыву, ні аўтарытэту. Тыя ж з прызначаных прадвадзіцелей, якія не валодалі зямельнай уласнасцю ў беларускіх паветах, «яшчэ менш адпавядаюць свайму прызначэнню. Першых мясцовыя дваране пад уплывам глухой палітычнай варожасці ігнаруюць, а другіх прама цураюцца…» [4, л. 63].

Аднак ужо праз некаторы час склалася сітуацыя, што пасады некаторых павятовых прадвадзіцелей дваранства стала немагчымым замяшчаць рускімі землеўладальнікамі ў сувязі з тым, што ў краі яны ці фармальна валодалі землямі, альбо не жадалі служыць. Таму ў 1868 г., калі Аляксандр ІІ праязджаў праз Вільню, генерал-губернатару А. Л. Патапаву было дазволена ў выключных выпадках прызначаць на пасады павятовых прадвадзіцелей дваранства асоб каталіцкага веравызнання [5, с. 42]. У выніку значная частка пасад прадвадзіцелей дваранства была замешчана католікамі з асяроддзя буйнейшых і ўплывовых памешчыкаў [4, л. 105]. У прыватнасці, толькі ў Мінскай губ. на канец 1869 г. з 9 павятовых прадвадзіцелей дваранства 7 былі католікамі. Гэта Ваньковіч (Мінскі павет), Наркевіч-Іодка (Ігуменскі), Кяневіч (Мазырскі), Горват (Рэчыцкі), князь Друцкі-Любецкі (Пінскі), Вайніловіч (Слуцкі) і граф О'Рурк (Навагрудскі) [6, л. 24].

Пад уплывам мясцовых дваран А. Л. Патапаў у сваіх справаздачах па ўпраўленні краем за 1871–1873 гг. паставіў пытанне аб магчымасці правядзення дваранскіх сходаў і выбараў на іх асобаў на замяшчэнне пасад ад дваранства ў органах дзяржаўнага кіравання. На справаздачы Аляксандр ІІ зрабіў паметку: «Абмеркаваць». Аднак на запыт Міністэрства ўнутраных спраў новы Віленскі генерал-губернатар П. П. Альбедзінскі рэкамендаваў адкласці вырашэнне дадзенага пытання на больш позні тэрмін ў сувязі з руска-турэцкай вайной [7, л. 1-2].

З 1884 г. Віленскім генерал-губернатарам быў прызначаны І. С. Каханаў, які лічыў, што павятовыя прадвадзіцелі дваранства рымска-каталіцкага веравызнання садзейнічалі правядзенню ў краі польскага ўплыву. Ён выдаў распараджэнне, па якім вакансіі прадвадзіцелей пачалі замяшчацца толькі з ліку дваран рускага паходжання. Аднак у гэтыя гады колькасць участкаў міравых пасрэднікаў у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях значна скарацілася, таму былі створаны аб'яднаныя павятовыя з'езды міравых пасрэднікаў. Гэта азначала, што шэраг павятовых прадвадзіцелей дваранства не маглі быць старшынямі гэтых з'ездаў і адпаведна атрымліваць жалаванне. Таму рускія дваране адмаўляліся займаць пасады прадвадзіцелей. У 1885–1886 гг. І. С. Каханаў распачаў перапіску з міністрам унутраных спраў аб аднаўленні з'ездаў міравых пасрэднікаў у кожным павеце. У выніку па законе ад 30 мая 1888 г. яны былі адноўлены ва ўсіх губернях Віленскага генерал-губернатарства [8]. Гэты закон прывёў да карэнных змен у складзе прадвадзіцелей дваранства, таму што сумяшчэнне пасад старшынь павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў і прадвадзіцелей дваранства католікамі супярэчыла закону ад 27 мая 1864 г., па якім католікі не маглі займаць пасад, якія былі блізка звязаныя з народам. На гэтай падставе І. С. Каханаў цыркулярам ад 12 ліпеня 1888 г. прапанаваў губернатарам звольніць усіх павятовых прадвадзіцелей дваранства рымска-каталіцкага веравызнання і замяніць іх праваслаўнымі, што ў хуткім часе і было зроблена [2, л. 77]. На канец стагоддзя абсалютная большасць прадвадзіцелей дваранства былі выхадцамі з унутраных губерняў імперыі.

На пачатку ХХ ст. рэзка абвастрылася як унутрыпалітычнае, так і знешнепалітычнае становішча Расіі. Пытанне аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. усё часцей

падымалася і ў Польшчы, і за яе межамі. Польскі сепаратызм стаў больш адчувальным. Пры гэтым разыгрывалася і палітычная карта Беларусі. Найбольш моцнай эканамічнай і палітычнай сілай у краі з'яўлялася памеснае дваранства рымска-каталіцкага веравызнання. Новыя імпульсы адчулі губернатары беларускіх губерняў. Таму, відаць, невыпадкова Магілёўскі губернатар Клінгенберг у сваёй справаздачы за 1902 г. узняў пытанне аб прызначэнні на пасады павятовых прадвадзіцелей дваранства мясцовых дваран-католікаў. Мінскі губернатар падтрымаў гэтую ініцыятыву. Акрамя таго, ён прапанаваў арганізаваць выбары кандыдатаў на пасаду губернскага прадвадзіцеля дваранства. На яго думку, выбары павінны адбыцца на дваранскіх дэпутацкіх сходах і сходах павятовых прадвадзіцелей дваранства, пры гэтым кандыдаты павінны выбірацца толькі з ліку павятовых прадвадзіцелей дваранства [4, л. 3, 7, 8]. Гродзенскі губернатар выказаўся і за выбары дэпутатаў дваранскіх сходаў і апек [4, л. 18]. Аднак сур'ёзнай рэакцыі з боку ўрада і імператара на гэтыя прапановы не адбылося.

У канцы 1904 г. актывізаваўся ліберальна-апазіцыйны (асноўную сацыяльную сілу складала дваранская інтэлігенцыя) і сацыялістычны рух. Імперыя імкліва набліжалася да рэвалюцыі. Адным з галоўных пытанняў было нацыянальнае. У сувязі з гэтым вельмі неахвотна, але вымушана урад пачаў прадпрымаць некаторыя прэвентыўныя меры.

Імянным указам Сенату ад 12 снежня 1904 г. даручалася распрацаваць шэраг мер па замацаванні дзяржаўнага і грамадскага ладу. У прыватнасці, прапаноўвалася «перагледзець дзейнічаючыя пастановы, якія абмяжоўвалі правы іншародцаў і ўраджэнцаў асобных мясцовасцей імперыі» [4, л. 389].

Адна з праблем, якая патрабавала свайго вырашэння, была праблема аднаўлення дваранскай карпарацыі ў 9 заходніх губернях. Гэтымі пытаннямі заняўся Камітэт Міністраў на сваіх пасяджэннях 15, 22 і 23 сакавіка 1905 г. У выніку дыскусій, якія разгарэліся на гэтых пасяджэннях, урад выказаўся за «аднаўленне дваранскіх сходаў з прадстаўленнем ім права выбіраць дэпутатаў і павятовых прадвадзіцелей дваранства» [2, л. 10].

У 5 беларускіх губернях да канца 1903 г. быў уведзены інстытут земскіх начальнікаў, старшынямі іх з'ездаў станавіліся павятовыя прадвадзіцелі дваранства з адпаведным дзяржаўным жалаваннем. Тым самым яны сканцэнтравалі ў сваіх руках усю адміністрацыйную і часткова судовую ўладу ў паветах. У сувязі з гэтым пытанне аб функцыях выбарных прадвадзіцелей было адным з галоўных. Пры гэтым Камітэт Міністраў адзначаў, што «асноўная мэта нашай палітыкі ў дзевяці заходніх губернях павінна застацца нязменнаю і зыходзіць з умацавання рускай перавагі і аслаблення тут польскага ўплыву» [4, л. 390]. Таму «ўскладанне ў Заходнім краі на прадвадзіцелей дваранства, якія пры аднаўленні выбараў могуць аказацца выбранымі з ліку палякаў, адміністрацыйных абавязкаў наўрад ці магчыма. Раз-пораз яно можа быць шкодным для поспеху рускай справы ў краі. Было б вельмі складаным даручыць ім вядзенне сялянскай справы і нагляд у гэтых адносінах за земскімі начальнікамі з правам іх абрэвізавання, а таксама пажадана адхіліць прадвадзіцелей палякаў і ад старшынства ў вучылішчных саветах» [4, л. 390].

Выкладзеныя меркаванні прывялі ўрад да пераканання аб перадачы прадвадзіцелям толькі ўнутрысаслоўных функцый. Усе ж адміністрацыйныя абавязкі павінны выконваць старшыні павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў.

Камітэт Міністраў вырашыў, што міністр унутраных спраў павінен унесці прапановы ўрада на разгляд Дзяржаўнага савета (без папярэдніх зносін з ведамствамі і генерал-губернатарамі), які зацвердзіць іх у прымальна кароткі тэрмін. Хаця ў імянным указе ад 1 мая 1905 г. і гаварылася аб узнаўленні дваранскіх выбараў у 9 заходніх губернях, але тут было і прылажэнне, па якім асобы польскага паходжання не маглі займаць адміністрацыйныя пасады па ведамстве Міністэрства ўнутраных спраў. Калі ж улічыць, што ў цэнтральных губернях і, асабліва, у паветах старшынямі гэтых адміністрацыйных пасад павінны быць прадвадзіцелі дваранства, то ў заходніх губернях, дзе патэнцыяльнымі прадвадзіцелямі маглі стаць католікі, узнікла праблема: як сумясціць палажэнне аб выбарах і функцыі прадвадзіцелей дваранства? [2, л. 427; 4, л. 394].

Пытанне аб аднаўленні органаў дваранскага самакіравання абмяркоўвалася ў Дзяржаўным савеце 5 і 30 лістапада 1905 г. На пасяджэнні 30 лістапада было адзначана, што ў сучасных умовах у сувязі з выданнем Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. такі закон не можа быць прыняты без адабрэння Дзяржаўнай думы. З другога боку, на падста-

ве царскага павялення ад 23 верасня 1905 г. разгляду Дзяржаўнага савета належалі ўсе справы, якія не цярпелі адкладу. У сувязі з гэтым 25 членаў Дзяржсавета палічылі, што пастаўленае пытанне якраз адпавядае царскаму павяленню. Аднак законапраект, які падрыхтаваў МУС, быў прадстаўлены не А. Р. Булыгіным, а ўпраўляючым МУС П. М. Дурнаво. Апошні ўнёс папраўкі ў законапраект, па якім павятовыя прадвадзіцелі дваранства ў 9 заходніх губернях надзяляліся тымі ж паўнамоцтвамі, што і прадвадзіцелі ўнутраных расійскіх губерняў, гэта значыць не толькі саслоўнымі, але і адміністрацыйна-упраўленчымі. У сувязі з гэтым Дзяржсавет 50-ці галасамі супраць 25-ці адхіліў законапраект П. М. Дурнаво.

Думку большасці Дзяржсавета агучыў Зіноўеў. Ён сцвярджаў, што ўзнаўленне дваранскіх выбараў у 9 заходніх губернях прывядзе да хуткага ўзмацнення польскага ўплыву, а край апынецца ў тым становішчы, у якім ён быў да 1863 г., калі дваранства Мінскай і Ковенскай губерняў выказалася за далучэнне гэтых губерняў да Польшчы [5, с. 88].

У сувязі з тым, што І і ІІ Думы аддалі прыярытэт аграрнаму пытанню, вырашэнне праблемы ўзнаўлення дваранскай карпарацыі ў заходніх губернях адцягвалася. 21 студзеня 1910 г. Падольскі губернскі прадвадзіцель дваранства І. Раковіч у дакладной запісцы на імя П. А. Сталыпіна прапанаваў правесці дваранскія выбары ў 9 заходніх губернях па дзвюх нацыянальных курыях – рускай і польскай. Пры гэтым руская курыя павінна была са свайго асяроддзя выбраць усіх прадвадзіцелей дваранства, сакратара дваранскага дэпутацкага сходу, а таксама палову членаў дваранскіх дэпутацкіх сходаў і палову засядацелей дваранскіх апек. Польскай жа курыі выпадала выбраць толькі астатнюю палову дэпутатаў і засядацелей [5, с. 95]. Аднак П. А. Сталыпін не падтрымаў дадзеную прапанову.

Пытанне аб аднаўленні дваранскай карпарацыі ў 9 заходніх губернях падымалася ў ІІІ Дзярждуме ў сувязі з увядзеннем земстваў. Аднак праваакцябрысцкая большасць забалаціравала яго. Прынамсі, П. А. Сталыпін указваў, што «ў апошні час наглядаецца спешная перафарбоўка Заходняга краю ў польскую фарбу, а ўвядзенне выбарных дваранскіх пасад толькі будзе садзейнічаць гэтай перафарбоўцы» [2, л. 155].

У 1913 г. старшыня камісіі па справах заходніх губерняў у IV Дзяржаўнай думе кн. Н. П. Урусаў адрасаваў пісьмы з шасцю пытаннямі ўсім губернскім прадвадзіцелям дваранства 9 губерняў наконт узнаўлення дваранскіх выбараў. У сувязі з гэтым Віленскі губернскі прадвадзіцель дваранства Красоўскі выказаўся наступным чынам: «Дваранства заходніх губерняў толькі часткова рускае, у большасці выпадкаў, асабліва ў трох губернях былога Віленскага генерал-губернатарства, польскае. Гэтыя часткі дваранства жывуць адасобленым жыццём і за рэдкім выключэннем маюць адзін з адным дзелавыя адносіны. Курыяльная сістэма выбараў у Дзяржаўную думу і земствы яшчэ больш адасабляюць гэтыя часткі вышэйшага саслоўя. У сувязі з гэтым у дадзены час нерэальна ўзнаўляць выбары, таму што ў Заходнім краі няма аднароднай дваранскай карпарацыі, а ёсць два дваранствы: рускае і польскае. Пры гэтым апошняе па сваёй згуртаванасці і інтэнсіўнасці карпаратыўнага жыцця значна пераўзыходзіць першае і таму, незалежна ад сваёй колькасці, мела б заўсёды перавагу на выбарах. Таму аднаўленне дваранскіх выбараў было б ўзнаўленнем іх толькі для польскага дваранства і стратай рускім дваранствам усякага прадстаўніцтва» [5, с. 155]. У гэтым жа сэнсе выказаліся і іншыя губернскія прадвадзіцелі дваранства Заходняга краю: Віцебскі – Рэнгартан, Мінскі – Даўгова-Сабураў і Магілёўскі – Бондыраў.

*Заключэнне.* Калі ў цэлым дваранскія карпаратыўныя арганізацыі ў Расійскай імперыі захоўвалі сваю прыхільнасць да царызму на працягу ўсяго перыяду капіталізму, то ў Беларусі становішча складвалася інакш. Апазіцыйнасць большай часткі дваранства рымска-каталіцкага веравызнання Паўночна-Заходняга краю да царскай улады стала прычынай таго, што палітыка царызму ў адносінах да дваранскага саслоўнага самакіравання ў краі пасля 1863 г. характарызавалася непаслядоўнасцю тактычных прыёмаў. Гэта тлумачылася як унутраным, так і знешнепалітычным становішчам, а таксама пазіцыяй тых ці іншых генерал-губернатараў. Разам з тым, генеральная лінія палітыкі ўрада на працягу ўсяго разглядаемага перыяду вытрымлівалася цвёрда і ўпэўнена. Яна была накіравана на паслядоўную русіфікацыю краю, узмацненне рускага ўплыву, аслабленне сепаратызму вышэйшага саслоўя рымска-каталіцкага веравызнання. Таму аднаўленне дваранскай карпарацыі ўзмацніла б уплыў дваран-католікаў на ўсе сферы жыцця беларускага грамадства.

*Літаратура*

1. Свод законов Российской империи. – СПб. : Изд-во Кодификац. отд. при Гос. совете, 1899. – Т. 9. – 412 с.
2. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106.
3. Высочайше утвержденное положение Комитета Министров. – О правилах на случай объявления каких-либо местностей Западных губерний на военном положении // Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – 2-е собр. : в 55 т. – Т. 36 (1861 г.). – Отд. 2.– № 37328. – С. 225–226.
4. РДГА. – Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 41.
5. Справка по вопросу о восстановлении собраний и выборов дворянства в девяти западных губерниях (Составлена канцелярией постоянного Совета объединенных дворянских обществ). – Б.м., б.г. – Ч. 3. – 201 с.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1828.
7. РДГА. – Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 7.
8. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. – О восстановлении отдельно для каждого уезда съездов мировых посредников в Виленской, Ковенской и Гродненской губерниях и о назначении уездных предводителей дворянства председателями уездных по крестьянским делам присутствий в Могилевской губернии // ПСЗРИ. 3-е собр. : в 33 т. – Т. 8 (1888 г.). – Отд. 1. – № 5281. – С. 301.

*References*

1. Svod zakonov Rossijskoj imperii. – SPb. : Izd-vo Kodifikac. otd. pri Gos. sovete, 1899. – T. 9. – 412 s.
2. Rasijski dziaržaŭny histaryčny archiŭ (RDHA). – F. 1276. Vop. 1. Spr. 106.
3. Vysochajshe utverzhdennoe polozhenie Komiteta Ministrov. – O pravilah na sluchaj ob'yavleniya kakih-libo mestnostej Zapadnyh gubernij na voennom polozhenii // Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii (PSZRI). – 2-e sobr. : v 55 t. – T. 36 (1861 g.). – Otd. 2.– № 37328. – S. 225–226.
4. RDGA. – F. 1283. Vop. 1. Spr. 41.
5. Spravka po voprosu o vosstanovlenii sobranij i vyborov dvoryanstva v devyati zapadnyh guberniyah (Sostavlena kancelyariej postoyannogo Soveta ob'edinennyh dvoryanskih obshchestv). – B.m., b.g. – Ch. 3. – 201 s.
6. Nacyjanalny histaryčny archiŭ Biełarusi. – F. 295. Vop. 1. Spr. 1828.
7. RDGA. – F. 1283. Vop. 1. Spr. 7.
8. Vysochajshe utverzhdennoe mnenie Gosudarstvennogo Soveta. – O vosstanovlenii otdel'no dlya kazhdogo uezda s'ezdov mirovyh posrednikov v Vilenskoj, Kovenskoj i Grodnenskoj guberniyah i o naznachenii uezdnyh predvoditelej dvoryanstva predsedatelyami uezdnyh po krest'yanskim delam prisutstvij v Mogilevskoj gubernii // PSZRI. 3-e sobr. : v 33 t. – T. 8 (1888 g.). – Otd. 1. – № 5281. – S. 301.